уже в отчете за октябрь 1941 г. сообщала о ликвидации 37 180 чел. Оперативная группа «А» с октября 1941 г. по январь 1942 г. уничтожила 41 828 чел. Позже масштабы злодеяний оперативных групп возросли. В отчете, датированном декабрем 1942 г., оперативная группа «Б» писала о ликвидации 134 298 чел.

Поражают цинизм и хладнокровие, с которыми фашистские палачи вели подсчет уничтоженных ими людей. 31 июля 1942 г. генеральный комиссар Кубе докладывал рейхскомиссару «Остланда» Лозе: За последние десять недель в Белоруссии ликвидировано около 55 тыс. евреев. В Минской области евреи ПОЛНОСТЬЮ истреблены». Только за два дня июля – 28 и 29 – в Минске фашисты уничтожили 10 тыс. евреев, половина из которых была привезена сюда по приказу Гитлера в ноябре 1941 г. из Вены, Брно, Бремена и Берлина.

УДК 94(476)

## СТАТУТЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

***І.А. Цурыкава, В.Ф.Радзецкая***

*УА «Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт»*

Самай значнай з’явай у развіцці феадальнага права Вялікага княства Літоўскага ў XVI ст. з'яўляецца распрацоўка і прыняцце Статутаў 1529, 1566, 1588 гадоў. Менавіта на XVI ст. прыходзіцца другі перыяд у развіцці права – статутны перыяд. Наяўнасць у дзяржаве падобных буйных нарматыўных актаў сведчыць аб высокім развіцці прававой думкі, культуры, адукацыі.

Статуты Вялікага княства Літоўскага рэзка адрозніваліся ад буйных нарматыўных актаў XIV-XV стст., як шырыней ахопу ўрэгуляваных правам грамадскіх адносін, так і юрыдычнай тэхнікай (раздзелы, артыкулы, якія маюць назвы).

Для Статутаў, і асабліва для Статуту 1588 г., характэрна ярка выражаная гуманістычная скіраванасць. Так, ужо ў Статуце 1529 г. уводзяцца прынцыпы адказнасці ўсіх толькі па законе і толькі па судзе. Па Статуце 1566 г. усталяваны ўзрост крымінальнай адказнасці с 14 гадоў і права простых людзей удзельнічаць у абранні вялікага князя; па Статуце 1588 г. узрост крымінальнай адказнасці быў павышаны - з 16 гадоў, і паказана толькі адна крыніца мімавольнага стану – палон.

Змест Статутаў сведчыць аб росквіце феадальнай дэмакратыі, зараджэнні новай формы правасвядомасці. Прагрэсіўныя становішчы і прынцыпы, замацаваныя ў іх, даюць падставы сцвярджаць, што ў Статутах паслядоўна праводзіцца ідэя ўсталявання прававой дзяржавы.

Кожны Статут распрацоўваўся адмыслова створанай камісіяй, куды ўваходзілі высокаадукаваныя, дасведчаныя людзі свайго часу. Напрыклад, у распрацоўцы праекту Статуту 1588 г. прымалі ўдзел Валовіч А.Б., Сапега Л.І., займаўшыя пасады канцлера і падканцлера, і, па ўспамінах сучаснікаў, высокаадукаваныя асобы. Як правіла, камісія працавала на працягу доўгага тэрміна (некалькі гадоў). Падрыхтаваны ёю праект Статуту неаднаразова абмяркоўваўся на соймах, затым дапрацоўваўся і прымаўся.

У Статутах знайшлі адлюстраванне розныя галіны права: дзяржаўнае (канстытуцыйнае), грамадзянскае, шлюбна-сямейнае, крымінальнае, працэсуальнае і іншыя. Але варта адзначыць, што часцяком нормы адной галіны права ўтрымоўваюцца не ў адным, а ў розных падзелах. Так, у Статуце 1588 г. нормы крымінальнага права замацаваныя ў падзелах X-XIV і часткова ў падзелах I, II і інш.

Витебский государственный технологический университет

Статуты Вялікага княства Літоўскага – гэта збор дзейсных законаў дзяржавы ў XVI у., але не адзіны. Нараўне са Статутам дзейнічалі прывілеі і пастановы.

Статут 1588 г. як больш змястоўны і больш дасканалы перажыў існаванне самой дзяржавы і дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі аж да 30-х гадоў XIX ст. нават тады, калі Беларусь знаходзілася ў складзе Расійскай імперыі.

Дзяржаўнае права прасякнута ідэяй вяршэнства закона як асноўнай характэрнай рысы, уласцівай прававой дзяржаве. Вялікі князь абавязваецца выконваць законы краіны.

Дэмакратызм дзяржаўнага права выяўляецца ў шматлікіх яго нормах, якія замацоўвалі прынцып выбарнасці манарха, абмежаванне яго ўлады законам, Радай і соймам.

Нормы дзяржаўнага права сведчаць аб духоўным пераломе феадальнага грамадства ў XVI ст., у прыватнасці яго правасвядомасці. У іх прадугледжваецца імкненне заканадаўца стварыць больш спрыяльныя, спарадкаваныя нормамі права ўмовы існавання чалавека ў грамадстве, замацаваўшы такія прагрэсіўныя прынцыпы, як выбарнасць, калегіяльнасць, законнасць, адказнасць, аддзяленне суду ад адміністрацыі, удзел у судзе прысяжных і інш., што дапамагала пазбегнуць сацыяльных выбухаў у грамадстве.

Большасць інстытутаў грамадзянскага права (асобы, уласнасць, рэчы, абавязанні, даўнасць, праваздольнасць, дзеяздольнасць і інш.) знайшлі даволі поўнае адлюстраванне ва ўсіх трох Статутах.

Нормы Статуту – гэтае яркае пацверджанне праявы закона дыялектыкі – адзінства і дужанне супрацьлегласцяў, бо ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI ст. панаваў феадалізм, але ў нетрах яго ўжо фармаваліся новыя грамадскія адносіны – буржуазныя. Гэты пераломны час, у якім знаходзілася феадальнае грамадства, і адбіўся ў Зборы законаў, якім з'яўляюцца Статуты 1529, 1566, 1588 гадоў.

Калі ж казаць мовай фактаў, дык перш-наперш адзначым, што Статут 1588 г. на працягу 200 гадоў лічыўся самым дасканалым зводам законаў у Еўропе і адным з самых дэмакратычных. Па сутнасці гэта канстытуцыя арыстакратычнай рэспублікі. Значны ўплыў зрабіў Статут і на прававую думку Еўропы. Так, ён паслужыў узорам пры стварэнні ў 1648 годзе расійскага зводу законаў Сабornага ўкладання. Цэлыя раздзелы гэтага кодэксу былі проста ўзяты з літвінскага Статута. Карысталіся ім і ў Польшчы як крыніцай права ў заканадаўстве. Паводле Статута, у XVII стагоддзі працавалі суды ў Латвіі, Эстоніі і на Украіне. Статут пераклалі на нямецкую, украінскую, расійскую, польскую, лацінскую і французскую мовы. Ну, а Літва жыла паводле ягоных законаў амаль да сярэдзіны XIX стагоддзя. Такі вось плён працы ўсіх тых, хто прыняў чыннасць у стварэнні гэтай вялікай кнігі літвінаў.

УДК 1

## О ВОЗРОЖДЕНИИ ДУХОВНОСТИ В СОВРЕМЕННОМ ОБЩЕСТВЕ

***Л.И. Костюченко***

*УО «Белорусский торгово-экономический университет потребительской кооперации», г. Гомель*

Духовность является одним из определяющих аспектов культуры, выступает в качестве движущей силы человеческих отношений. Об отсутствии духовности у современного человека и о необходимости ее возрождения сейчас немало пишется и говорится, т.е. это очень актуальная проблема.



Витебский государственный технологический университет